Год II. Пятніца, 18 лютага (феўраля) 1921 г. № 7.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. | Цана асоб. нумэру 6 марак. | Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Плебісцыт і беларусы.

Паміж Літвой і Польшчай ідуць гарачыя спрэчкі аб тым, каму павінны належаць абшары Віленшчыны і Горадзеншчыны.

Мы, беларусы, пражываючыя на гэтых абшарах, кажам, што калі плебісцыт будзе адбывацца толькі паміж Літвой і Польшчай, то мы выкажамся за Літву.

Гэта, аднак, не азначае, што мы адмаўляемся ад сваіх нацыянальных ідэалаў, што мы ня хочам быць незалежнымі. Зусім не. Мы толькі выбіраем лепшую дарогу, па каторай шыбчэй дойдзем да незалежнасьці. А тое, што мы ідзём з Літвой, а ня Польшчай,—вынікае з адносін да нас Польшчы і Літвы, як у цяперашні час, так і раней. Калі нам кажуць, што „Беларусі няма“, або што яе „праз пяцьдзесят гадоў ня будзе“, то дзе той нягоднік сярод нас, што аддаў-бы бацькаўшчыну на сьмерць. Але, калі з намі ці з нашым Урадам гавораць, як роўны з роўным, падпісваюць умовы аб згоднай супольнай працы і падтрыманьні, а ня зьбіраюцца нас есьці, то мы ўсёю душою і заўсёды падтрымаем нашых дагаворнікаў. Калі-б, аднак, плебісцыт захапіў тэрыторыі уступленыя бальшавікамі ня толькі Ліцьве, а і Польшчы, то тады з большай пэўнасьцю на усьпех можна-б было высунуць пытаньне аб трэцяй старане, г.-ё. аб Беларусі. Тады галасаваньне адбывалася-б па формуле 1) за Літву, 2) за Польшчу, 3) за Беларусь. Зусім магчыма, што і Ліга Народаў і Савецкая Расея, а за імі і Літва і Польшча згодзіліся-б на ўключэньне у лік змагаючыхся старон і трэцяе—Беларусі.

Гэта было-б самым справядлівым разрашэньням пытаньня аб прыналежнасьці спорных тэрыторый да той ці іншай стараны. Што мы, беларусы, маем права трэбаваць уключэньня нас у лік змагаючыхся, як трэцяй стараны,—калі плебісцытны абшар пашырыцца і на тэрыторыі, уступленыя бальшавікамі Польшчы, — ня можа быць ніякіх спрэчак, аб гэтым сьведчыць статыстыка.

Каб нам не супярэчылі, што мы мыляемся, прыводзячы статыстычныя даныя, каторых нашы супраціўнікі не прызнаюць, возьмем выцяжкі з працы польскіх прафэсароў п. п. Кржыжаноўскага і Куманецкага „Tablo de statistique“, Kraków 1915. Па даным гэтай польскай статыстыкі аказваецца што:

У паветах:	беларусаў:	жыдоў:	палякоў:	ліцьвіноў:
1. Дзісьненскім	81,11	10,10	2,39	—
2. Лідзкім	73,13	12,05	4,67	8,65
3. Ашмянскім	79,97	12,07	1,75	3,77
4. Сьвянцянскім	45,51	7,14	5,98	33,74
5. Вялейскім	86,88	9,59	2,45	—
6. Віленскім	25,84	21,99	20,12	20,92
7. Пружанскім	75,48	12,86	1,37	—
8. Горадзенскім	65,69	19,86	5,66	1,42
9. Слонімскім	80,78	15,20	1,55	—
10. Ваўкавыскім	82,38	12,37	2,15	—
11. Навагрудзкім	83,66	12,29	1,66	—
12 Пінскім	74,30	19,50	2,60	—

Ітак, перад намі статыстычныя данныя, апрацаваныя польскімі прафэсарамі, праўда, у той час, калі пытаньне аб прыналежнасьці пералічаных паветаў ня было прадметам вайскова-палітычных спрэчак Нам скажуць, што ад 1915 г. да цяперашняга мамэнту многае зьмянілася. Так,—зьмянілася,—ня дзеля нашае карысьці, бо не вярнуліся да апошняга часу нашы бежанцы-беларусы; але, ня гледзячы і на гэта, а таксама і на поўную немагчымасьць агітаваць за Беларусь і на свабоду польскай агітацыі, *мы усе-ж такі у пераважаючай большасьці*, і зусім пэўны у гэтым.

Наша бяда, што мы ня маем ні аднэй пядзі тэрыторыі, на каторай была-б наша беларуская уласьць. З гэтай прычыны мы павінны згаджацца на плебісцыт навет у такіх межах, дзе становім 80 з верхам процантаў. Такое палажэньне нявыгоднае для нас, бо пры ім у нашай роднай хаце чужанцы будуць весьці агітацыю за разьвал гэтай хаты, за спродаж нашай бацькаўшчыны з малатка. Але усе-ж гэта лепей, як далучэньне і падзел, без запытаньня ў нас, чаго мы хочам.

І так, *мы за плебісцыт, на усім уступленым бальшавікамі Ліцьве і Польшчы абшары*, з уключэньнем у лік змагаючыхся і Беларусі, як трэцяй стараны.

Вілянчук.

„Усерасейскі“ труп.

... Яны непапраўны—гэныя „ўсерасейскія“ прадстаўнікі!

Вялікія расейская рэвалюцыя ўжо разьбіла той лад, каторы ў путах няволі дзяржаў соткі гадоў сто шэсьцьдзесят міліёнаў чалавечых душ. Расея—гэная штучная, абапертая на гвалце і прымусе сувязь дзесяткоў зусім чужых ей народаў—рассыпалася ў той самы мамэнт, як развалілася „ўсерасейская“ ўлада. І кожын народ, скінуўшы паганае ярмо няволі, пайшоў далей ужо сваей уласнай дарогай, будуючы свой уласны дом—сваю асобную дзяржаву.

Дзяржава „ўсерасейская“, як і „ўсерасейскі“ урад, перасталі істнаваць. „Усерасейскасьць“—гэта труп. Але труп гэны, замест спакойна ляжаць у сваей магіле, дагэтуль бадзяецца па сьвеце, напамінаючы вольным народам панурую мінуўшчыну старой Расейскай дзяржавы.

Праўда, шмат каму дужа няпрыемна сьмерць гэнага пагібшага волата: многа неаплачаных крэдытораў ліюць сьлёзы па прапаўшых міліёнах, некалі пазычаных Расеі ў золаце. І вось, пад націскам сваей буржуазіі, найбольш пры гэтым пацярпеўшай, заходнія дзяржавы зрабілі спробу ажывіць „усерасейскі“ труп.

Першая спроба была зроблена з Колчаком. „Антанта“ прызнала ўрад, створаны гэным няўдачлівым, хоць і сьмелым адміралам, за ўласьць усерасейскую. Але на гэтае прызнаньне вострым пратэстам адказалі ўсе тыя народы, якія вырваліся на волю з „усерасейскіх“ абоймаў: у Парыжы дэлегацыі сямёх новых рэспублік (Беларусі, Украіны, Лацьвіі, Эстоніі, Грузіі, Азэрбайджану і Паўночнага Каўказу) падалі міравой конфэрэнцыі супольную ноту пратэсту, заяўляючы, што пасьля аддзяленьня іх ад Расеі на можа быць ніякае гутаркі аб нейкай „усерасейскай“ уладзе. У такім-жа духу зрабіла конфэрэнцыі заяву і літоўская дэлегацыя. І „Антанта“ хутка адцуралася ад свайго гадунца, разьбітага бальшавікамі і пакінутага „белымі“...

На зьмену Колчаку быў зьявіўся генарал Дэнікін, за ім—Врангель. Дэнікін пагіб, не пасьпеўшы атрымаць патэнту на „ўсерасейскага“ ўладара. Врангеля-ж прызнала адна толькі Францыя, але і ён назаўтра згінуў...

А тымчасам жыцьцё прымушала і прымушаець „Антанту“ прызнаваць адну за аднэй незалежныя дзяржавы, утвораныя на руінах старое Расеі. Ужо прызнаны Лацьвія, Эстонія, Грузія, прызнана фактычна Літва і Украіна, а за імі сьледам ідзе Беларусь, атрымаўшая прызнаньне ад Савецкае Расеі і ад так цесна зьвязанай з „антанцкімі“ дзяржавамі Польшчы.

Труп „усерасейскі“ гэтак пачынаюць закапываць у зямлю.

Але яны ня могуць супакоіцца—гэныя прадстаўнікі „ўсерасейшчыны“. У Бэрліне расейская чорная сотня пры падмозе нямецкай рэакцыі строіць усё новыя і новыя пляны аб адбудове старое Расеі з „усерасейскім“ імператарам на чале. У Парыжы расейскія соцыялісты і дэмакраты зьбіраюць членаў разагнанага расейскім народам „усерасейскага“ установчага сходу і абдумываюць праект, як з падмогай францускай буржуазіі ізноў закаваць у путы няволі вызваліўшыяся ад Расеі народы і паставіць над імі дэмакратычных „усерасейскіх“ жандараў і „усерасейскую“ ахранку...

Ды дарэмна. Як-бы яны ні стараліся ажывіць „усерасейскі“ труп, якімі-бы токамі яго ні электрызавалі,—ні нямецкім манархістам, ні францускім банкірам ня ўдасца вярнуць да жыцьця тое, што памёрла. Жывыя народы у працягу вякоў пакутаваўшыя пад „усерасейскім“ ярмом, не пазволяць узьдзець яго сабе нанова. Мінуў ужо час, калі можна было тварыць дзяржавы з розных народаў, заваёўваючы іх сілай. Цяпер толькі вольная воля вольных народаў можа злучаць іх у дзяржаўныя саюзы,—і на кожную спробу гвалту і прымусу яны адкажуць аружнай барацьбой.

„Усерасейскі“ труп не ўваскрэсьне, ня гледзячы на дружныя, на зьдзіў солідарныя стараньні расейскіх чорнасоценцаў і манархістаў—з аднаго боку і расейскіх соцыялістаў і дэмакратаў—з другога.

Хай-жа будзе яму лёгкай зямліца, каторая ўрэшце закрые ад сьвету гэты ганебны сымвал уціску і няволі!

Г. Б.

„Зямельная рэформа“ на Беларусі

Зямельная рэформа ў Сярэдняй Ліцьве задзержылася, затое ў заходняй Беларусі яна ўжо праводзіцца ў жыцьцё. Пазнаёмімся з ёй.

Варшаўскі Сойм прыняў дзьве зямельныя пастановы, якія датычаць 22-х паветаў заходняй Украіны і Беларусі, губэрняў: Валынскай, Менскай, Горадзенскай і часьці Віленскай (паветы: Дзісьненскі, Вілейскі і Лідзкі). Першая пастанова называецца: „Аб пераходзе зямлі на ўласнасьць гаспадарства“, другая „аб надзеле зямлёй жаўнераў польскага войска“.

Па першай пастанове да польскага гаспадарства пераходзяць усе былыя гаспадарсьцьвенныя, маёрацкія, духоўныя і фундушовыя землі. Польскае гаспадарства мае права забраць усе прыватныя апушчаныя маёнткі, асабліва такія, гаспадар якіх знаходзіцца ў адсутнасьці. Апрача таго, польскае гаспадарства мае права заўладаць зямлёй прыватных двароў, гаспадары якіх там жывуць, пакідаючы ім 400 гэктараў (троху менш за 400 дзесяцін) зямлі. За ўзятую зямлю будзе заплочана—абшарнікі ня будуць пакрыўджанымі. Польскае гаспадарства забіраець усю гэтую зямлю, каб разьбіць яе на калёніі паміж польскіх жаўнераў зямельна рэформай.

Якой маецца быць гэтая рэформа? Найперш зямля будзе раздавацца жаўнерам польскага войска. „Інваліды і жаўнеры польскага войска, якія па сваёй волі пайшлі ў польскае войска і адбылі франтавую

службу“, дастануць зямлю дарма. Усе іншыя інваліды, таксама жаўнеры здольныя да зямляробства могуць дастаць зямлю за грошы, на колькі хопіць запасу. Надзелы не павінны перавышаць за 45 гэктараў.

Кожды надзелены землёй або купіўшы яе павінны пад пагрозай страты надзелу асесьці на ім і у працягу 3 год завясьці гаспадарку. Адведная зямля ня можа быць прададзена ні падзелена ў працягу 25 гадоў.

Той, хто купляе, ў працягу 4 гадоў нічога ня плоціць польскай скарбніцы; пачынаючы ад 5 году плоціць у працягу 30 гадоў грашавую вартасьць ад 1½ да 5 пудоў жыта ад кождага гэктара што год.

Гаспадарства будзе памагаць дэмабалізаваным жаўнерам жывым і мёртвых інвэнтаром (коні, вазы і г. д.), будаўнічым матар'ялам, урэшце грашавою падмогаю з двухміліярдавага капіталу, які знаходзіцца ў распараджэньні Міністэрства Зямляробства.

Гэта галоўны зьмест абедзьвюх пастаноў. Жаўнеры польскага войска дастануць зямлю ў заходняй Беларусі на надта выгодных варунках і зразумела пацягнуцца да яе. А што дастанець тамтэйшае насяленьне? Пытаньне гэтае ставіць і эндэцкая „Rzeczpospolita“ і піша ў № 26 гэтага году:

„Меснага насяленьня ёсьць больш за 4 з палавінай міліёны, з яго да 85 процэнтаў сялян і дробнаўласьнікаў. Стыкаючыся з польскімі дзеячамі, насяленьне гэтае, як каталіцкае, так і праваслаўнае заўсёды высказывала найвялікшую зацікаўленасьць, якое становішча займець польскі ўрад у зямельнай справе... Прадставім сабе, як будуць прыняты і расталкаваны названыя ўстановы сялянствам. Ня інакш, як у той спосаб, што ўрад польскі забіраець усю зямлю на карысьць польскага жаўнера, ня дбаючы аб патрэбах меснага насяленьня, не пакідаючы для яго нічога.“ Навет другая катэгорыя жаўнераў, якая мусіць купіць зямлю, дастанець яе столькі, колькі яе астанецца ад падзелу паміж першай катэгорыяй.

«Rzeczpospolita» прадугледжывае навет, што правядзеньне ў жыцьцё тых пастаноў можа прывясьці да конфлікту з месным насяленьнем, якое, дзякуючы сваёй шчыльнасьці, надта патрабуець зямлі». «Як трэба правадзіць калёнізацыю, — вучыць «Rzeczpospolita» — можна павучыцца ў немцаў.»

Тым часам пастанова гэтая ўжо праводзіцца ў жыцьцё. Пры даводзтвах аддзельных дзівізій пяхоты і брыгад коньніцы ўжо зарганізаваліся спэцыяльныя камісіі. У бліжэйшым часе будуць складзены павятовыя надзельныя камітэты. «Rzeczpospolita» піша, што «да старостваў ўжо звароч͡ваюцца гейкія паручнікі за надзелам для іх зямлі, прадназначанай для калёнізацыі.»

«Rheczpospolita» прадугледжывяець, што «пры агульнай няяснасьці межаў, пры шахаўніцах і ўсякіх сэрвітутах каморніцкая (землямерная) праца выклікаець войстрыя непаразуменьні паміж вайсковымі аддзеламі і насяленьнем. Будзе гэта, ўважайце, незадаваленьне глыбейшае, чым цяперашняе з-за рэквізыцыяў пашы або падвод, з якімі, няхай сабе, насяленьне ўжо пагадзілася. Якія могуць быць з гэтага вынікі, адсылаем да часу закладаньня вайсковых калёній Аракчэевым» — 100 гадоў таму ў царскай Расеі.

(«Паходня».)

Самазванны „бацька“.

У кожнага народу, які жыве у сваім гаспадарсцьве незалежна, ёсьць галава, каторы называецца розна: прэзыдэнт, кароль, князь, цар, султан, шах і гэтак далей. Такі галава—або вібіраецца народам, або займае сваю пасаду з „божай ласкі“. Як бы там ні было, — уласьць такіх галоў на нечым абаперта: або на волі народу, або на гістарычнай традыцыі. Так водзіцца ў незалежных гаспадарствах. Зусім іначай выходзіць з народамі, якія у цяперашні час толькі яшчэ імкнуць да дзяржаўнай незалежнасьці. У такім палажэньні знаходзіцца Беларусь, Украіна і інш. Іх тэрыторыі знаходзяцца пад чужацкай акупацыяй. Іх законныя, выбраныя народнымі прадстаўнікамі урады ня могуць у цяперашні час працаваць на сваёй бацькаўшчыне і змушаны жыць заграніцай, шукаючы там падтрыманьня сваім незалежніцкім імненьням.

Карыстаючыся з такога цяжкога палажэньня нашае бацькаўшчыны, розныя авантурнікі набіраюць сьмеласьці навязываць сябе у павадыры нашага народу. Так, усім нам добра вядомы па прошлагодняму выступленьню Булак-Балаховіч, які імянуе сябе то генэралам(?) то бацькам, абвяшчвае сябе камандзірам усіх паўстанчаскіх беларускіх атрадаў, а законны беларускі ўрад з Вацлавам Ластоўскім на чале — ворагам беларускага народу*) Вольнаму-воля, шалёнаму-поле. Людзей „шалёных“ цяпер многа, і „бацька“ Балаховіч гэта добра ведае. На яго кліч зьбягуцца з усіх канцоў „партызаны“ вядомай маркі, катoрым ня так ходзіць аб тое, каб вызваляць бацькаўшчыну, каторай у іх няма, як „пагуляць“, паграбіць людзей, паграміць жыдоў, як гэта было у Палесьсі прошлым летам. Мы усімі сіламі душы пратэстуем проціў падтрыманьня новай авантуры самазваннага „бацькі“, які ўжо раз запаскудзіў сьвятую беларускую справу пагромамі і грабежствамі. Няпраўда, быццам паўстанцы беларускія прызналі над сабою уласьць Балаховіча, як ён аб гэтам піша. Гэта не паўстанцы і не беларусы.

Той, хто ня хоча компромітаваць беларускую справу ў вачох усяго сьвету, за Балаховічам ня пойдзе і „бацькам“ сваім яго ня прызнае. Кіньце маніць, пане „бацька“ што вас нехта прызнае. Можаце хоць што хочаце пісаць на паперы пра законны беларускі ўрад Вацлава Ластоўскага. Можаце яго не прызнаваць і навет абвешчываць яго ворагам беларускага народу.

Але хто параіў вам назваць сябе бацькам гэтага народу? Сьмех ды й голькі! Які вы каму бацька? Якая старонка ёсьць на сьвеце, штэ захоча лічыць вас хоць бы сваім сынам, ня то што бацькам?

Радашковец.

*) Гл. прыказ „бацькі“, які надрукаван быу у № 6 „Н. Д.“

Абвінавачываю.

Такі загаловак мае брашура, напісаная палкоўнікам Ліхачовым, быўшым памоцнікам усім ведамага Булак-Балаховіча, з якім ён разышоўся у палітычных поглядах. У гэтай брашуры палкоўнік гаворыць толькі аб асобе Балаховіча і злачынствах, якія „бацька“ зрабіў уласнымі рукамі. У тую самую пару,—апавядае палкоўнік, — калі быўшы тэрарыст Барыс Савінкаў узяў пад апеку „бацьку“, перакапаўшыся, што Булак-Балаховіч ёсьць дэмакрат, які строга карае пагромщчыкаў — у гэты самы час зроблены злачынствы і гвалты. Дзеля гэтага ён хоча выступіць да грамадзянства з ніжэй сьледуючым абвяшчэньнем:

Генарале Булак-Балаховіч! Вінавачу Вас у ніжэй сьледуючых злачынствах:

1. Дня 11 жніўня прыехалі Вы у спэцыяльным цягніку (поездзе) на станцыю „Талька“. Зажадалі Вы ад загадчыка варштатаў, каб Ваш вагон, які патрабаваў папраўкі, быў напраўлены ў дзьве гадзіны. На адказ інжынэра, што папраўка патрабуець ня менш за 12 гадзін бо, ў Тальцы няма запасных рэсораў, выцягнулі Вы свой інкруставаны золатам браўнінг і выстралілі ў голаву інжынэра, які ўпаў трупам да Вашых ног. Бяз усякай прычыны згінуў айцец вялікай сям'і.

2. 13 га жніўня застралілі Вы на станцыі „Варэйка“ дагледчыка вадакачкі затое, што лакаматыў Вашага поезду ня мог набраць вады. Не памаглі ні сьлёзы старога, ні даказы, што вадакачка папсавана, і ён адзін ня можа яе направіць. Жаўнерам сваім Вы дазволілі абрабаваць дом дагледчыка, што тыя зараз-жа і споўнілі.

3. 16-га жніўня Вашыя жаўнеры, абрабавалі ў вёсцы Дараганава два жыдоўскія дамы (больш жыдоўскіх дамоў там ня было), а калі абабраныя жыды (Быхма Людкоў і Іцка Муляр) зьвярнуліся да Вас з просьбай памагчы ім, загадалі Вы харунжаму Дуглінскаму спыніць гэтыя крыкі. Харунжы Дуглінскі споўніў Ваш загад, і абодва жыды былі расстрэлены на Вашых вачох.

4. 18-га жніўня застралілі Вы сваёй рукой 80-х гадовага жыда Вольке Надэльмана, каторы зьвярнуўся да Вас з просьбаю аб помачы для сваей 14 гадовай унучкі, якую жаўнеры гвалцілі блізка цэлы дзень. Застралілі Вы спарога ў той мамэнт, калі ляжаў ён у Вашых нагах і цалаваў Вашыя боты.

5. Гэтага самага дня Вы застралілі дагледчыка палустанку «Пераезд № 5» Міхаіла Валасова затое, што ён дазволіў выслаць да сябе са сьледуючай станцыі запасны лёкаматыў, што было прычынай затрыманьня Вашага поезду на гэтым палустанку на поўгадзіны. А калі жонка дагледчыка прыбегла і пачала прасіць аб літасьці да мужа і бацькі некалькіх дзяцей, дазволілі Вы свайму эскорту зрабіць з гэтай маладой і прыгожай кабетай усё, што яны хацелі. Гэта было эскортам дакладна споўнена.

Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры.*)

Як бачым, беларуская адраджэнская літэратура ад пачатку XIX ст. ажно да 80-ых гадоў выяўляе два ідэалы — і абодва явы не нацыянальнага, а грамадзянскага характару. З аднаго боку стаяць нашы шляхоцкія рамантыкі з ідэалам патрыархальнай гармоніі і згоды вёскі з дваром, ідэалам справядлівасьці на грунце і ў рамках прыгоннага ладу; з другога — першыя нашы дэмакраты-народнікі, якія супроць панства выстаўляюць мужыцтва, сялянства, як сілу, роўную паном, сілу, якая павінна атрымаць належнае ей месца ў жыцьці краю. У прымірэньні гэтых дзьвюх сіл— панскай і мужыцкай — ідэал Кондратовіча (Сыракомлі). А Кастусь Каліноўскі, каторага пад шыбяніцай, чытаючы прыгавор суда, пракурор назваў „шляхціцам“, рэзка пратэстуе проці гэтага назову: „Няпраўда! У маей Бацькаўшчыне няма шляхты: ўсе роўныя!“ Але і Сыракомля і Каліноўскі працуюць і пішуць або прад самым скасаваньнем прыгону, або ў часе, калі акт аб волі толькі йшчэ праводзіўся ў жыцьцё, не пранікнуўшы глыбей да сьвядомасьці народу. І гэтак іх грамадзкі ідэал—гэта йшчэ якбыццам кліч да волі, гарачае жаданьне гэтай волі (аб палітычным ідэале адбудовы Рэчыпаспалітай тут не кажу). Нацыянальнага элемэнту ў беларускім разуменьні ня бачым яшчэ ані ў дэмакратаў, ані тым больш у шляхоцкіх пісьменьнікаў (Рыпінскі навет выразна кажа, што ён хацеў-бы, каб яго „мужычкі“ навучыліся перш чытаць, а пасьля і гаварыць па польску!). Няма гэткага сьвядомага нацыянальнага ідэалу ў іх і адносна да мовы беларускай, у якой усе яны пішуць: пішуць яны пабеларуску, бо народ так гаворыць!

Першы раз ў сваей літэратурнай працы выступае з беларускім нацыянальным ідэалам — ужо сьвядома нацыянальным — Мацей Бурачок (Францішк Багушэвіч). Грунт яго ідэолёгіі — бадай той самы, што і ў Каліноўскага: як і Каліноўскі, ён быў захоплены, з аднаго боку, ідэалам палітычнага вызваленьня Бацькаўшчыны ад расейскага панаваньня, з другога—ідэямі расейскага „народніцтва“. Але Мацей Бурачок робіць крок далей: яго захоплівае ідэя ня толькі палітычнага і соцыяльнага вызваленьня „простага“ народу, але і нацыянальнага. Яго „праўда“—абшырнейшая, чым „праўда“ Яські з-пад Вільні: яна абнімае і элемэнт сьвядома нацыянальны.

Ужо самыя адносіны Багушэвіча да беларускай мовы — зусім іншыя, чым адносіны ўсіх папярэднікаў. Ен піша пабеларуску ня толькі затым, што так гаворыць народ. Для яго мова—гэта „опратка душы“ народу. Гэта — адзнака індывідуальнасьці народу. „Беларусь—там, дзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мозыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава“. Мова—гэта інтэгральная, неаддзялімая частка народнае душы: без яе народ жыць ня можа! „Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скана314ньнем, катораму мову займе,—а потым зусім замерлі. Не пакідайце-ж мовы вашай беларускай, каб ня ўмерлі!“ Уся прадмова Багушэвіча да яго „Дудкі Беларускай“, з якой мы бярэм прыведзеныя тут думкі, — гэта-ж самае яркае выступленьне яго за беларускі нацыянальны ідэал. „Наша мова для нас сьвятая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым мы ею шмат і добрага, але так ужо мы самі пусьцілі яе на зьдзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахватней гавораць па францýску, як па свойму“. Багушэвіч разумее, што занянад мовы беларускай, саромлівасьць самых беларусаў гаварыць ею—гэта насьледак агульнага прыгнечаньня народу беларускага, утраты пашаны да сябе. І вось, каб тую пашану да сябе вярнуць, Багушэвіч лічыць патрэбным пачаць ад рэгабілітацыі ў вачах народу яго роднае мовы. А за гэтым ужо пойдзе і пашана да свайго мазаля мужыцкага, да сябе самога.

Паэтычная творчасьць Мацея Бурачка і мае на мэце разьвіваць у беларусаў гэну пашану да сябе, да свайго вобліку чалавечага. У шуканьне „праўды нашай“, аб якім Каліноўскі гаворыць яшчэ вельмі туманна, Багушэвіч укладае зусім конкрэтны зьмест.

Першым чынам Багушэвіч у сваіх вершах яркімі фарбамі малюе той зьдзек, які наш народ цярпеў і церпіць ад паноў і ад начальства. Рэзка крытыкуе ён увесь той грамадзкі лад, у якім жыве: у вершу „Бог ня роўна дзеле“ — яркі контраст між беднасьцю і багацьцем. А далей у „Песьнях“ (у «Смыку») малюе злую долю мужыцкую, апісвае «Панскую ласку», паказвае ўсе благія бакі нашага „панства“—бяз ніякіх прыкрас, так як ёсьць: урэшце выстаўляе ў сьмешным відзе „Панскае ігрышча“ — „панскія задушкі“, бо паны „ўжо сталі чыста гніць“. Так брыдзіць ён тым гніючым панствам, што просіць бабульку маліцца да Бога, каб ён панам ніколі ня быў! („Ахвяра“ ў „Дудцы“). А абрыдзіўшы тое, на што з падзівам і пашанай прывык углядацца наш мужык, Багушэвіч дае антытэзу панства—позытыўны ідэал:

Ня чурайся мяне, панічок,
што далонь пакрываюць мазолі:
мазоль—працавітых значок,
не заразіць цябе ён ніколі!
То мядаль за труды і за муку —
не хвароба якая з заразы!
Ня стыдайся падаць ты мне руку,
бо на гэтай руцэ няма сказы!

(„Ня чурайся“).

Гэтай мазалістай рукой створана ўсё багацьце сьвету:

Глядзі: касьцёл аж да неба,
воласьць бляхамі пакрыта!
Срэбрам скрые, калі трэба,
бо за гэта яго біта!..
А сам жыве ў мокрай яме,
дзьверы заткнуў ганучамі!
. . . .
Глядзі: горы паразрыты,
а чыгункай сьвет абвіты,
— ўсё з мужыцкай цяжкай працы!
(„Дурны мужык, як варона“).

Ідэю вызваленьня мужыка Багушэвіч разумее вельмі шырока: ён да крытыкі панства далучае вострую крытыку палітычнага ладу, крытыку прадстаўнікоў улады („У вастрозе“), пратэст проці ўрадовага гвалту над сумленьнем людзкім, проці „наварачаваньня на „казённую веру“ розгамі і катаваньнем („Хрэсьціны Мацюка“). А ўрэшце будзіць у народзе гарачае ўмілаваньне да роднай зямлі („Свая зямля“), да яе хараства, якое глыбока захоплівае паэта.

А. Навіна.

(Працяг будзе.)

*) Гл. № 5 „Н. Д.

6. 20-га жніўня Вы застралілі унтэр-афіцэра А. Копэльмана затое, што той зьвярнуўся да Вас з просьбай спыніць пагром жыдоў, які ўчынілі харунжы Дубінскі і ахвотнік Муракоў на весцы Скакісы. Да эскорту свайго Вы зьвярнуліся са слоўмі: „Вазьмеце адсюль гэтага жыдоўскага сабаку“.

7. 22-га жніўня ў дарозе ад Даргакова да „Разьезду № 8“ Ваш поезд застанавіўся сярод дарогі. Вы са сваім эскортам увайшлі на лёкаматыў і папыталіся машыніста аб прычыне затрыманьня поезду. Той адказаў, што мае замала пары ў катле, бо дровы, што ўжывалі на апал, былі са старых і гнілых бэляк, а дарога з гэтага месца ідзе пад гару, дзеля таго трэба падгатаваць больш пары. „Зараз будзе даволі пары“, закрычэлі Вы і, адчыніўшы печ лёкаматыву, загадалі жаўнерам кінуць машыніста ў печ. Загад быў споўнены, і бедны машыніста быў на Вашых вачох спалены жыўцом.

8. У вёсцы Кавалі Вы застралілі бяз суда і сьледзтва каля 20 сялян, калі тыя зьвярнуліся да Вас па грошы за фураж, што Вашыя жаўнеры забралі ў іх. Адначасова Вы апавясьцілі астаўшыхся жыхароў вёскі, што калі яны ня споўняць усіх жаданьняў жаўнераў, то вёска будзе абкружана жаўнерамі і падпалена з усіх бакоў.

Генарале Булак-Балаховіч! Абвінавачываю Вас публічна ў дакананьні вышэй азначаных злачынстваў, нягодных чалавека, які гаварыў, што „ваюець за дэмакратызм і за вызваленьне рускага народу з-пад ярма бальшавікоў“. Я быў з Вамі толькі 10 дзён, і ў працягу гэтага часу зрабілі Вы толькі злачынстваў, што Сьценька Разін зьбялеў-бы. Я пакінуў Вас, калі пераканаўся, што Вы подлы праступнік, які даўно павінен быў вісець на шыбеніцы. Дык вось-жа абязьвіньцеся!

І што на тое гаворыць Вайсковы Надпракуратар? Што на тое польская прэса. Пад суд злачынцаў. Ня можам маўчаць. У Польшчы Балаховічы знаходзяцца на свабодзе. Польшча іх корміць, Польшча дае ім прыпынак! Сорам!

(Даслоўны пераклад з № 35 „Dziennika Robotniczego“ ад 8 лютага 1921 году, які выходзіць у Лодзі).

Палітычныя заметкі.

Віленская эндэцыя (польскія паны) апынулася у бязвыхадна-дрэнным палажэньні. Апошняя іх надзея на далучэньне літоўска-беларускіх абшараў Віленшчыны і Горадзеншчыны пры помачы Сойма так званай „Сярэдняй Літвы“ разьбіта ў шчэнт.

А так працавалі, так стараліся... Ну, думалі, далучэньне забясьпечана. А тут,—на табе! На самым, здавалася-б, цьвёрдым месьце праваліліся у... балота.

Як у свой час было і з маскоўскімі чарнасоценцамі — „кажинный разъ на эфтомъ самомъ мѣстѣ“.

Такая ўжо доля падобных паноў ува ўсіх краёх — праваліваюцца яны у наш час з трэскам, з гакам, з галавой.

Трэба, аднак, прызнаць, што ня толькі адны польскія эндэкі пацярпелі фіяско у акцыі за Віленскі Сойм. Ідэю Віленскага Сойму падтрымлівалі і такія польскія групы, як „Адраджэньне“ і „Партыя Польскіх Соцыялістаў“. Іх становішча па пытаньню аб Віленскім Сойме было іншым, чым у эндэкаў. Яны стаялі за фэдэрацыю Сярэдняй Літвы з Польшчай, для чаго лічылі патрэбным склікаць у Вільні Сойм, каторы і прагаласаваў-бы пытаньне аб фэдэрацыі з Польшчай.

Гэтым польскім групам добра было вядома, што беларусы, ліцьвіны, жыды і наагул усе, апрача палякоў, адмовіліся ісьці на выбары ў Сойм. І усё-ж такі адраджэнцы і пэпэсы пайшлі, знаючы, што польскі элемэнт у Сярэдняй Ліцьве не становіць большасьці. Значыцца, гэтыя польскія групы хацелі накінуць нам сваю волю, хацелі гаварыць у Сойме аб волі народу, большая частка якога не паслала-б сваіх прадстаўнікаў. І гэтакая пазіцыя польскіх адраджэнцаў і пэпэсаў была вялікай іх абмылкай, калі не скандалам для іх.

Польскія газэты у Вільні, адбіваючыя розныя кірункі польскай палітычнай думкі, пасьля таго як дэкрэтам гэн. Жэлігоўскага выбары у Сойм спынены, не знаходзяць цьвёрдага тону для выхаду з утварыўшагася для іх палажэньня. Нам здаецца, што і ня знойдуць. Бо-як, пасьля абароны ідэі Сойму, пачаць бараніць плебісцыт пад кантролем Лігі Народаў? Палажэньне бязвыхаднае. Найпрасьцей—астацца пры сваім старым становішчы і, значыцца, пайсьці за „Стражай Крэсовай“, каторая на сходзе, скліканым у Вільні 6 лютага г.г., вынесла ўжо рэзалюцыю аб недапусьцімасьці плебісцыту „пад ахранай чужацкіх штыхоў“, з чым зусім згаджаецца і папярэдняя (да адмены выбараў у Сойм) палітычная пазіцыя і адраджэнцаў і пэпэсаў.

Прыпамінаецца нам і барацьба гэтых груп з п. Падэрэўскім (польск. эндэкам), выступіўшым у Заходняй Эўропе процію ідэі Сярэдняй Літвы і Віленскага Сойму і выказаўшымся за плебісцыт. Цяпер і Начальнік Польскага Гаспадарства—пад час свайго пабыту у Парыжу—у размове з старшынею Лігі Народаў Лявонам Буржуа запэўніў яго, што Вільня будзе эвакуавана гэнаралам Жэлігоўскім, як толькі будзе устаноўлены тэрмін плебісцыту і прыйдуць паміжнародныя войскі для акупацыі Віленшчыны.

Ідэя плебісцыту, як відаць, перамагла, бо і Літоўскі Урад даў сваю згоду на плебісцыт пры варунках выпаўненьня Лігай Народаў вядомых гарантый, аб якіх чытачы нашы могуць даведацца у аддзеле кронікі гэтага N.

Ітак, і Польшча і Літва прызналі патрэбным скончыць спрэчкі з-за Віленшчыны і Горадзеншчыны дарогаю плебісцыту. Каб ня было ніякіх прашкод, то можна-б было ў хуткім часе дачакацца выкананьня плебісцытнага заданьня.

Якія-ж могуць быць прашкоды?

Разумеецца,—ні агітацыя „Стражы Крэсовай“ процію „чужацкіх штыхоў“, ні палітычны тупік, у якім апынуліся тутэйшыя польскія партыі, а іншае. На адну з прашкод указвае тая самая нота Літоўскага Ураду да Лігі Народаў. У ей паміж іншым гаворыцца, што „Літоўскі Урад споўніў прапазіцыю Лігі Народаў завязаць перагаворы з Савецкім Урадам з мэтай атрыманьня ад яго згоды на прыбыцьце паміжнародных войскаў для забясьпечаньня безапаснасьці на спрэчных тэрыторыях, прызнаных за Літвой 12 ліпеня 1920 г.“ Але, гаворыцца далей у ноце, „да апошняй пары не дасягнена сталых вынікаў у гэтым адна-шэньні“, і значыцца, „дапушчэньне паміжнародных войскаў грабіла-б выклікаць новыя асклажненьні і навет аружны конфлікт замест жаданага заміраньня“.

Такім чынам, даючы сваю згоду на плебісцыт, Літоўскі Урад ставіць яе у залежнасьць, паміж іншым, ад згоды з боку Савецкай Расеі, становішча каторай па гэтаму пытаньню зусім ігнараваць Літва ня можа, па прыведзеным у ноце матывам. А Савецкая Расея вуснамі народнага камісара Чычэрына выказвае сваё „credo“ па плебісцытнаму і наагул „сярэдня-літоўскаму“ пытаньню вось як (поўны тэкст ноты ў аддзеле кронікі). Чычэрын заяўляе, што „суверэнная ўласьць ў Вільні і яе абшары належыць Ліцьве, каторай яна была перададзена на моцы расейска-літоўскага дагавору“. Выходзячы з гэтага палажэньня, Чычэрын трэбуе ад Літоўскага Ураду „прыняць усе магчымыя крокі для устраненьня такога палажэньня спраў у Вільні, пры якім гэты горад зьяўляецца асяродкам вайсковага авантурызму і белагвардзейскіх элементаў, атрымліваючых там магчымасьць падгатоўваць агрэсіўныя дзеяньні процію Савецкіх рэспублік“.

Што датычыць паміжнародных атрадаў на плебісцытнай тэрыторыі, то Чычэрын выказваецца аб іх так:

„Мы выказваема цьвердую надзею, што Літоўскі Урад не дапусьціць паяўленьня у Вільні падобных атрадаў, прысутнасьць якіх там Расейскі Урад змушаны разглядаць, як недружалюбны у адносінах да Расеі акт, пагражаючы безапаснасьці Савецкіх рэспублік“.

Ці зьверне Ліга Народаў увагу на становішча Урадаў Літвы і Савецкай Расеі па памянутым пытаньням, трудна сказаць. Магчымасьць паразуменьня паміж Лігай Народаў і Савецкай Расеяй ня выключана.

І як нам здаецца, уся труднасьць выхаду з утварыўшагася палажэньня ёсьць у тым, што Польшча не прызнае бальшавіцка-літоўскага дагавору 12 ліпеня 1920 г., па катораму часьціны Віленшчыны і Горадзеншчыны Расея перадала Ліцьве, а Расея, выходзячы з гэтага пункту свайго права, адкідае права Польшчы на заняцьце уступленых Ліцьве тэрыторый „да той пары, покуль пытаньне аб прыналежнасьці азначаных тэрыторый ня вырашана дарогаю дагавору паміж Літвой і Польшчай на карысьць апошняй“.

А покуль што пытаньне аб плебісцыту запутываецца...

І. М.

Як Лявон хадзіў на пошту.

(Адрывак.)

Дарога ў мясьцечка ляжыць праз Цёмны Лес—спрадвечны, магутны, яшчэ запраўдны лес, добра вядомы жыхаром усяго павету.

Было вельмі рана, калі пасьпеў Лявон прайсьці вёрст сем і з гэтага ўзгорка зусім блізка прад-сабою, за вярсту, ня болей, убачыў ён Цёмны Лес і ахапіўся ціхай радасьцю. Цёмны Лес—слава ўсяго краю і душа яго людзей.

Сонца прыпякае мацней. Слабееyь пах жыта і румянкі. Высыхаець астатняя расінка, вышэй уздымаецца важкі пыл. Цёплае, густое, араматнае паветра—здалеку над жытам лягчэйшае і пераліваецца, блiскучае, на сонцы. Заківаюцца ціхія, спакойныя каласы, і на шчаку ад іхнага боку прыемна дыхнець цёплая, любая і ціхамірная радасьць жытнага поля.

Лявон нагнаў баб. У разнаколерных спадніцах і кохтах, з кошыкамі. Ідуць, як для баб, даволі шыбка, а ўсё гамоняць і гамоняць. Што—ня можна яшчэ добра пачуць, а ўжо далятаюць паасобныя словы і сказы:—„Ці праўда?“— „А, божачка ты мой!“ — „А йдзі ж ты яшчэ...“ і сьмяюцца і йдуць, босыя, толькі пяткі пад спадніцамі падлятаюць.

Нейкі малады хлапец ляжаў збоку дарогі, схаваўшы перад тулава ў жыта, а ногі спусьціўшы ў канаву. І цяпер устаў і пашоў з імі разам, бо, відаць, з аднае дзярэўні (ў гэтым краі беларусы ня кажуць вёска). І ён ідзець з кошыкам у маліну ў Цёмны Лес, ўстаўшы, пеўна, чуць толькі золак. Чырвоная, кумачовая сарочка, сялянскія саматканыя штаны. У лапцях—значыцца, ў маліну, а не ў мясьцечка на кірмаш.

З правага боку ля дарогі разьляглося жыта, а з левага боку, за гарою, раптам паўстае ўбаччу царква сярод гаю, ніжэй—сяло П. і даўно пакінуты, абязьвечаны, стары млын-вятрак бяз крыльля. Ды ўсё-чыста наўкол абмяжаецца лесам. Яго паска цягнецца ўсьцяж, усюдых, без адзінае пярэрвы, там вышэйшая, а там ніжэйшая. І толькі за сялом ледзьва відаць яна вёрст за пяць, а можа і за дзесяць—далёка, далёка прападае; сплываецца ў малошна-сінім тумане. У доле зеляненецца мужыцкая — зялёныя шнуры ды чарнейшыя межы—ярына, якую тутэйшыя мяккаэрыя беларусы называюць ярърю; ля самага ж сяла—папар, а патутэйшаму парiня. Як казяўкі поўзаюць, віднеюцца каровы. Быццам якiясь чорныя кусточкі і белыя плямкі—пасуцца авечкі. Неба сіняе, сіняе, вялікае-бяздоннае расхінула свае абоймы над зямлёю. Паглядзіш наўкол, і хіба толькі з-за вакаёму (гарызонту), з чужыны нясьмела і зрэдку пакажаць аблачынка свае рэдкія, блядыя, няроўныя краі, што зараз і растаець,—сіне, ані воблачка! Яшчэ ж дужа рана, гадзін сем можа, а сонца пачынае млець. Будзе гарачы дзень. Покуль што лёгка: ногі йдуць і ня чуюць зморанасьці, а вочы й душа плывуць за хвалямі па калосьсю. Жаўцеючае жыта ціха калыхаецца, а як зірнеш далей—хвалі бягуць адна за аднэй, то ў той бок, то ў той, а найболей пад Цёмны Лес, і там іх ужо ня відно. І няма тут дзе ім разгуляцца, бо вось ён лес. Часьцей лётаюць авадні, цягне чымсь асаблівым, сваім, лесавым.

Дарога ўвайшла ў вузенькі калідор сярод дрэў, які лепей назваць тунелем, бо і ўверсе надта густа сплялося вецьце. Там-а-тут па дарожцы трапляецца і лезець пад ногі карэньне, стагадовых дрэў-волатаў. Сьвятая ціша і прахаладзь; навет прыкра, што бабы гамоняць, ойкаюць і скачуць, як козы, зьбіўшы ці ня зьбіўшы босую нагу аб карэнь у зямлі. Было-б зусім прыемна чуць нешта жудаснае, трывожна-супакойнае у найменшым шорасе леса. Было-б зусім натуральна адчуваць даўна-мінулы, даўна-пражыты час і зрыхтованай істотаю чакаць, што вось-вось зьявіцца з-за грубага, каравага камля бярозы старадаўны крывічанін з стрэламі і лукам ці выйдзе вядзьмак-чараўнік з сівою барадою і вусамі, з капою белага валосься замест калпака, у доўгай белай вопратцы, падпяразаны лыкам, з даўгім кійком у ссохлай, белай, а магутнай руцэ. Косы сонца не прапікаюць скрозь ператкапае суччо бяроз, сосен і елак, асабліва-ж скрозь лапы хвой, і густы сьцень ляжыць на дарозе. Зусюль чуецца халадок і яшчэ нешта гэткае, што бывае толькі ў лесе і не ў абы-якім, а толькі ў такім, як Цёмны Лес. Унізе гушчары ляшчыны, дробнага альшэўніку, лазы і маладых асінак. Часам, як зірнеш, так ўсё зарасло, што й пралезьці немагчыма. Страх падумаць, што Цёмны Лес цягнецца на дзесяткі вёрст удоўжкі, а ў іншых местах і ўшыркі і што можна ў ім заблудзіцца. Жудаснае, гнятучае чуцьцё выклікаюць гэтыя спрадвечныя лесавыя асілкі сваёю веліччу, гушчынёю, паўсёдным змрокам. Яны давяць чалавечую душу, шэпчучы ёй аб яе адзіноце і мізэрнасьці. Але яны даюць і супакой... Навет шкада, што тут, па дарозе ў мясьцечка,—толькі вузкая у тры вярсты стужка Цёмнага Леса сярод двух поль, што вось за тымі вялікімі, цьвёрдымі разложыстымі дубамі цёмная гушча лісьця пачынае рэдзець. Не, гэта яшчэ ня поле, а толькі Лясьнікова Паляна. Хваліць Бога, бабы павярнулі з дарогі, пераскочылі праз канаву і шыбка разыйшліся у розныя бакі. Лявон здагадаўся: там расьцець шмат малiньніку. Калі тут, ўздоўж дарогі, і то даволі часта сідзяць малінавыя кусты, з тонкімі, пад колер сасны, былінамі, з белаватым падысподам лістамі і нясьпелымі, тож белаватымі ягадкамі. Ня скора яны пасьпеюць тут: бадай як жыта пажнуць, як надойдзе і малінавы канец. Ішоў Лявон далей і заўважыў, што памыліўся: гэта яшчэ не Лясьнікова Паляна, а проста невялічкая палянка, за каторай часьцей і часьцей трапляюцца такія самыя прагалінкі, ці проста галы... Вось тая, ледзьва відная сьцежачка ўбок ад дарогі ля сьцесавай троху і заплыўшай (малою, кучматай і вілкаватай сасны. Здаецца, дужа прыкметная сасна, а як лёгка прамінуць і яе і сьцежачку. Сьцежачка вельмі скарочае дарогу ў мясьцечка; па ёй цянькамі можна выйці зараз на шлях з Г. на М., пры якім і ляжыць тое беднае мясьцечка Ш. Раней, помніцца Лявону, зараз, ад дарогі, вісеў пры сьцежцы на дубе драўляны уніяцкі крыж увесь сточаны і чорны ад старасьці, падпаясаны шматком сівага ад дожджу палатна. А цяпер таго крыжа няма, проста на дубе баўтаецца быццам кавалак бабскага фартука, а побач з дубам ляжыць цераз самую сьцежачку зломаная бярэзіна. Хто хоча—абходзіць, ёсьць слабенькі тор, а хто хоча—лазіць цераз высака ўзьнятты камель ці пад ствол. Хоць-бы лясьнік парэзаў яе ці мужыкі ўкралі. Яшчэ троху прайшоўшы—пень, дасканальна гнілы, і здаецца, неўзабаве—ткі зваліцца...

Раптам, неўспадзеўкі для свайго ранейшага ходу думак, збачыў Лявон пад куст ляшчыны, разаслаў свой шэры жупан (удвара хадзіў заўсёды у сваіх хатніх вопратках), лёг дагары, расьцягнуўся, прыпаў усім целам да зямлі, а душою зьліўся з лесам.— „Ці яна і наогул усе яны—інтэлігенты, а памужыцку проста паны, ці яны вразумеюць маё шчасьце ляжаць у лесе на жупане?“— задаў сабе пытаньне Лявон, адпачываючы салодка і здарова ад дарожнай зморанасьці. Разважаў і ляжаў звычайны сялянскі хлапец: у белай вышыванай сарочцы, чорных штанох і ботах з халявамі. Адно было ня зусім, як у сялянскіх хлопцаў: шапка. Ня любіў маскоўскага картуза; ня любіў яго і насіў „шляхоцкую“ з кароткім, круглым полем шапачку; і ня зусім шляхоцкую з маленечкім польскім картузом (брыльком), бо і такой, панскай, ня любіў, а выбіраў, купляючы, троху падобную да ангельскай. Інтэлігенты твар і шапка зьбівалі з толку мясьцячковых крамнікаў і дзевак на цьвінтары пры царкве, бо хто яго ведае: па ўсім—дзяцюк сялянскі, а галава ні-то шляхецкая, ні-то якаясь троху панская.—

Кароткі нарыс.

Заўсёды малююць і цікавяцца рознымі пекнымі старонкамі, а пра нашу ўбогую, зьнішчаную Беларусь мала дзе чутно. Нікому ў голаў ня прыйшло заглянуць у той куток Беларусі, дзе ўвесь час адбывалася вайна. Апяваць гэту зруйнованую краіну, мне здаецца грэх, усё роўна, як грэх пяяць тады, калі памрэ матка, бацька альбо хто з бліжэйшае радні. Вось, калі грэх апяваць, што трэба аплаківаць, то трэба аплакаць.

Выпадкова мне здарылася быць у тэй частцы Ашмяншчыны, дзе калісь былі багатыя мястэчкі, як Валожын, Вішнеў, Бакшта. Там дзе бывала знаходзілася вёска ля вёскі, у якіх хата стаяла ля хаты так цесна, што навет застрэшкі падходзілі адзін пад адзін, дык цяпер ад усяго гэтага засталіся адны сьлёзы. Дзеня-дзе пачынаюць людзі будавацца. Эх, людзі! як яны жывуць? Божа Ты мой мілы! Цэлыя тысячы людзей голых, босых, абадраных і галодных сядзяць у зямлянках па лясох. Падыйшоўшы, навет блізка, да гэнае зямлянкі, ні завошта не дадумаешся, што там жывуць людзі. Як вядома, зямлянкі аброслыя травою, увалены, бярвеньне тырчыць як папала, вокан няма, а глядзіш—неўспадзеўкі вылазіць адтуль чалавек. Не ўважаючы на рознае надвор'е, ён, небарака—адзеты ў трамці, чорны, цёмны, трудна сказаць, што ён беларус, а скарэй падумаеш, што гэта дзікар. Але ён нядзікар. Яго гора прымусіла так жыць. У той час, калі людзі ядуць чысты хлеб, гэты дзікар-беларус рад, што мае хлеб, зроблены з травы, зьмешанае з мерзлаю бульбаю. У тую пору, калі зьбіраюць з поля жыта, пшаніцу й ярыну, гэтыя бедакі-беларусы стараюцца чым болей назьбіраць вядомае ужо ім травіцы.

Але як бы цяжка ім ня жылося, усётакі яны ня трацяць свае нацыянальнае самабытнасьці. Жывучы ў такім становішчы яны ня чулі нічагусенька аб сваёй бацькаўшчыне Беларусі, і калі я сказаў, што ў гэтай ваколіцы адчыніцца беларуская школа, ў якой будуць вучыць дарма, дык яны плачуць ад радасьці, кажучы, што яны думалі, што пра іх усе забыліся. З якою прыхільнасьцю адносяцца сяляне да беларускіх школ, трудна выказаць на паперы. Школы беларускія перапоўнены вучнямі, й навет тыя вучні, каторыя хадзілі, да польскіх школ, пакінулі вучыцца там, а пашлі ў беларускія. Дзякуючы гэтым пераходам з польскіх школ у беларускія, здарыўся адзін цікавы выпадак. Ксёндз Забрэскае парахвіі, даведаўшыся аб гэтым, забараніў каталіком вучыцца ў беларускай школе, пагражаючы ім тым, што ня рыме іх да споведзі і г. д. Некаторыя бацькі перш і ня пусьцілі сваіх дзяцей да беларускае школы, а потым раздумаліся й ізноў прыслалі, не зьвяртаючы жаднае ўвагі на ксяндза. Такім чынам і каталікі й праваслаўныя ходзяць вучыцца да беларускіх школ. Мушу заўважыць, што у вёсцы Савічы Вішнеўскае воласьці ў беларускай школе 36 вучняў, з каторых толькі 6 праваслаўных, а 30 каталікоў.

Школьны інструктар.

НА ЧУЖЫНЕ.

Нічога роднага... Чужое ўсё вакол...
Муры высокія, а ў іх чужыя людзі.
О, як жадаў-бы я узьняцца, як сакол,
Каб паляцець туды, дзе радасьней мо'
будзе.
Дзе ўдасцца, можа, мне нанова
засьпяваць,
І струны лірныя крануць ізноў рукою,
І духу творчасьці бяз меры набываць,
Ад працы цяжкае ня ведаці спакою.
Дык да цябе, мой мілы, родны краю,
Імкне душа мая і рвецца ў вышыню,
Бо на чужыне, тут я ціха паміраю
Дый ня жыву, а сплю і волю тваю сьню.

Краўцоў Макар.

Лодзь, 14.I.1921.

Эрос і Псіхэя.

Я хацеў-бы глянуць ў твае вочы,
Там тайніцу душы адчытаць,
І ў трывожнай жыцьцёвай паўночы,
Я хацеў-бы ў іх праўду шукаць.

Разгарнуць твае чорныя косы,
Цалаваць а паўночнай цішы,
На твар вызваць сьлязістыя росы,
Аддзяліці твой дух ад душы.

Сьлед іроніі з вуснаячкі сьцерці,
Заглыбіцца да язьні на дно, —
Для заблуднага сьвету умерці
І стварыці вясельле адно.

Не таі, ня віляй—а прызнайся,
Што таёмна ты любіш мяне, —
А ці я... Ты мяне ня пытайся:
Прада мной ты на яве і ў сьне.

Дай душу мне сваю—больш ня трэба,
Творчы дух ты народу аддай,
І так жыйма абое для неба,
І сваім ты мяне называй.

Казімір Сваяк.

Нуда па весцы.

Як нудна тутка мне жывецца,
Здалёк ад вёскі дарагой,—
Як птушка, сэрца ў грудзях рвецца,
Скарэй пабачыцца-бы з ёй.

Мне тутка ўсе, усе чужыя,
Дамы і людзі і сады,
Нідзе ня выглявуць мілыя
Жыцьця вясковага сьляды.

Мне цесна тутка, між мурамі
Паветра сьвежага няма,
Свабодна дыхнуць каб грудзямі,
Кругом смурод, гарачыня.

А там... а там красуецць поле,
Зялёны лес шуміць кругом,
І веска сьпіць бы ў арэоле,
Спавіта сьветлым ручайком.

Вось першыя збудзілісь птушкі,
Хоць поле, лес і рэчка сьпіць;
Над вёскай ўзьняўся дым істужкай,
Бо сталі ў печах ўжо тапіць.

Там песьні родныя ліюцца
Вясёлых жнеяў і касцоў,
А ў лесе рэхам аддаюцца
Сьпяваньні також пастухоў.

І мне усё, усё тут міла:
І лес і поле і ручэй,
І тут павінна быць магіла
Няшчасьцю й долі злой маей.

Вінцук Сталяронак.

Вільня 1920 г.

Мае жыцьце.

Цяпер я знаходжуся дома, прыехаўшы на Каляды да сваіх бацькоў з Вільні, дзе вучуся ў Беларускай гімназіі. Бацькі мае небагатыя, дык прыехаўшы ў госьці няма чым пажывіцца. Хлеба трохі маюць, ды і той папалам з мякінай. Як яшчэ ня было вайны, дык мы жылі багата, а як найшла вайна ды загрукалі арудзіі, ды застукалі куляметы, мы павінны былі ўсё кінуць, усяго вырачыся і выяжджаць у бяжэнцы. Як толькі мы выехалі, дык наша ўсё папалілі, паразносілі. А як вярнуліся, дык на чыстае поле. А поле было пазарастаўшы кустамі, а дзе не зарослы, дык так было ўдзерванеўшы. Каня мы свайго ня мелі, дык прыходзілася поле ўскопываць лапаткай. А лапаткай, вядома, як накапаеш, ды яшчэ галоднаму, разоў некалькі капанеш, і ужо чалавек абамлеў. Кусок—які бульбы пасадзім, а зіма вялікая, есьці трэба, а тут невядома, адкуль узяць. Гэты год як-кольвек па кусочку крапяцца, але ўсё яшчэ цяжка. Год таму назад мы надта галадавелі, ня было а нічога, ані ўрот. Быў таксама ў нас сабачка. І яму пры нас нічога ня было есьці. Быў ён у нас доўга, схудаў ён зусім, а пасьля ўзяў і здох з голаду. Доўга бедаваў я па сваім другу, але што зрабіць, калі і самому ня было чаго есьці. Аж той год я служыў у ваднаго гаспадара. Бо ў дому ня было чаго есьці. Прыехала да мяне мая мама і гаварыла, што з нашай вёскі Шутавічаў у Вільню паехала многа хлапцоў вучыцца. Дык і мне надта хацелася ехаць разам з хлапцамі вучыцца, я аж плакаў, бо надта хацелася ехаць. Мама мяне умаўляла, што паеду на другі год.

Прытулковы вучань 1-ае клясы Віл. Белар. гімназіі Антось Жабінскі.

„Не, яна ніколі б не зразумела мае прыемнасьці ад пылу ботаў і варсаватай грубізны суконнага жупана,"—з нудою ўздыхнуў Лявон, адылі зноў раптам страхануўся, крутка перавярнуўся ніц, прыпаў усей істотай да зямлі, распасьцёр крыжам рукі, прытуліў правае вуха да травы, да паху зямлі, і слухаў, як шуміць лес, слухаў, слухаў, слухаў, аж сонца ўрэшце нейкім дзівам прабілась да яго і прыпякло шыю. І ўсхапіўся, каб не спазьніцца на пошту, пачуў дур у галаве і з прыкрасьцю і злосьцю голасна сказаў:

— Я-ж бы яе узьненавідзіў...

Злаваў страшэнна з-за тае драбніцы, што ведаў, што барджэй гэны гнілы пень, куст ляшчыны і зломаная бярэзіна зразумеюць яго, чымся яна... наогул яны, інтэлігенты, а памужыцку проста розныя, ня зусім панскага роду паны. Найгорш тое, што і яна, і навет без усяго ўсякага, а каб зрабіць яго беларускасьці прыемнасьць, напнула б на сябе вышываную сарочку з бусамі і касьнікамі і кароткую і вузенькую, але даматканую спадьнічку і гоцала б, як сьвятая патароча, на панскім ігрышчы. Дзікая злосьць ахапіла яго, быццам запраўды відзіў ужо не з вялікім болем перад сабою ў гэным „бѣлорусскомъ костюмѣ". І ціша Цёмнага Леса адхінулася ад яго, як ад заразы, і не давала яму, папсаванаму, свае вялікае радасьці спрадвечнага супакою.

Ішоў па сьцежцы, як няпрыкаены, як адарваны ад разумнае гармоніі і кінуты ў страшна прыкры непарадак, дзе брудна-каравае ніколі ня зробіцца стройным і правільным. — „Зьнялюбеці б ты мне, як той папянок (папоў сын), што сказаў мэндалевай дачцы, скончыўшай гімназію: „Літвіновіч таму ня любіць блісучых гузікаў і какарды, што хоча быць брыгікалам..."

Ішоў па сьцежцы сярод гусьценькага ляшчыньніку.

Даляцеў да вушэй глухі, няясны гук, адылі пачуліся людзкія галасы, і ўрэшце—вось яна, Лясьніковая Паляна. Высокія і густыя кусты маліньніку. І тут ходзяць бабы; чырвоная ці белая галава вытыркаецца і зноў схаваецца там, дзе чуецца прыглушоны ад радаснай прагавітасьці гоман: гэтулькі маліны, ай-я-я-я! І хлопцы й дзеўкі бяруць яе, панайшлі здалёку, хоць яшчэ вельмі рана, Есьць вёрст за дваццаць.

Лявон троху прыстоіў ля кустоў і сашчыпнуў і зьеў некалькі надта ж буйных, салодкіх, смашных лесавых малін.

Нейкі хлопец недалёчка стаіць і паглядае, муліцца, каб спытацца і пытаецца:

— Здалёка, браце?

— Здалёка... Ну, а што?

— Нічога, так сабе. І мы здалёка...

— А...

Сказаў Лявон гэтае „А..." ужо бяз злосьці. А тое, што сказаў „Ну, а што?"— тое не папраўіш, хаця і шкода.

На Лясьніковай Паляне ходзіць навязаная на даўгой вяроўцы рыжая карова, скубець канцы быльных траў. Махае хвастом, чмыхае мордай па баках ад мошак, разам дрыгаець-тупочаць нагамі і мнець траву і звоніць балабонам. На пні сядзіць пастушка,—дзяўчынка гадкоў з дзесяць, худзенькая, беленькая, у белай хвустачцы, у кароценькай, лінялай спадьнічонцы. Заўважыла яго, але наўмысьля, каб ведаў, што ей—няхай сабе, хто-б ня-йшоў, круціць у руках недавіты вянок, быццам пільна ўець, і далей цягне-мармочаць песьню, быццам пільна пяе, нікім і нічым не адхілёная ад свайго занятку.— „Маніш ты, дзеўка! Толькі й думаеш, хто я гэткі, скуль і ці гляджу на цябе." Не, ня ўзьнімаець галавы і ціха бязуважна, машынальна вымаўляе:

Дарогаю ды шырокаю,
Туды б ішла ды сіротачка...

Але бяздушна сьпетая песьня мае свой гэткі нуды, гэткі тужлівы, гэткі лесавы матыў, аж цяжка ад яго. Быццам ваўкі выюць, быццам і камары зьвіняць, быццам і Цёмны Лес гудзіць. А хай цябе з такою песьняю! Цягне душу з цела:

Туды б ішла ды сіротачка...
Сустрэў яе ды сам госпад бог...

Незразумелая таска кляшчамі сьціснула лявонага сэрца. Хай цябе, хай цябе з такою песьняю. Так і зьвініць камаром у вушшу. А гэта што за дзіва? На вокнах лясьніковай хаты—фіранкі, чаго зроду, зьвеку, спрадвеку ня было у тутэйшых мужыкоў. Не пасьпеў мінуць ён хаты, як дзяўчынка ззаду, з пня крыкнула:

— Марыся! бачыш?

Фіранка ў вакне на гародчык закалыхалася,—гэта кінулася ў вочы Лявону, як мімаволі агляну́ўся. А толькі зірнуў, як сабака-ганчак рантам, зьнецяйку, як загаркочаць ка яго з-за вугла пуні, як пакопіцца кумільгам, як заскачаць ля чалавека:

— Гар-гар! гар-гар-гар!!!

Аж сэрца замлела, спужаў, каб ты прапаў. А ў руках хоць бы травінка.

— Вэн, вэн!—ціха крычэў Лявон і адбіваўся ад яго высьпяткам.

— Ня бойцеся, ён ня кусашчы! Нёман,—на, на, на! ня сьмець, ну, пашоў!—пачуў Лявон з ганку і, ўзьняўшы вочы, увідзіў дзяўчыну з простай, бяз хвусткі галоўкаю, з нявыказана прыемнаю усьмішкаю на чыста-дзявоцкіх вуснах і апранутую так, як апранаюцца настаўніцы з простых сем'яў, прыехаўшы на лета да бацькоў.

— Можа гэта і будзе мая жонка— блісвула троху містычная, троху жартаўлівая думка.

З запраўдным любаваньнем заглядзеўся на яе хлапец і слухаў яе сымпатычны, чысты голас:

— Ня бойцеся, ён ня кусашчы.

— Як на які час, дачушка!—сказаў стары лясьнік, выходзячы са стрэльбаю на плячох з-за той жа пуні і ветліва даткнуўся брыля і кіўнуў хлопцу галавою— „А найлепі то я прапушчу вашэці, бо там на дарозе будзе бегчы яшчэ адзін мой сабака.

Лявон, ня маючы у пару слоў, заківаў з вялікай удзячнасьцю дзяўчыне і яе бацьку, надзеў шапку, яшчэ раз церaз плячо паглядзеў на яе стройненькую фігурку і пашоў побач з лясьнікам. Нёман вінавата віляў закручаным „правілам", пацёрся ля гаспадара і пабег за Марысяю.

— Марыся! гой-гой!—крычэла меншая дзяўчынка.

— Я табе пагойкаю, свавольніца,— не азірнуўшыся і з ласкай бурнуў пад доўгія, белыя вусы сівы лясьнік і потым з цытаньнем кінуў вокам на Лявона:

— Васпан да мясьцечка?

— Ага... Сьпяшаюся на пошту.

— Ай, вось добра, што сказалі. Можа б мелі ласку,— троху канфузьліва стаў прасіць стары,—занесьці і нашае пісьмо, заказанае паслаць.

— Чаму ж, з прыемнасьцю.

— Дык я зараз. Марыся! Марыся!— клікаў стары, пабегшы назад трушком,— давай сюды пісьмо!

Паненка зноў выйшла на ганак і аддала бацьку пісьмо, нешта саромліва і ціха сказаўшы яму.

— Эт, глупства, што там!—адказаў на яе словы лясьнік,—усе свае людзі. А скуль, браце?

Лявон назваўся.

— Го, то я й бацьку вашага добра знаю, калісьці мелі кумпанейства. Але ж пан гэтак увабраўся,— што хто й пазнае,—з падвоенай ветлівасьцю і значна сьціплей (скрамней) казаў стары і навет трошачку, ледзьва прыкметна, а ўсё ж, відаць, ня зусім сьмела падаў руку Лявону.

Марыся дужа пачырванела, кіўнула галоўкаю на звычайнае знаёмства і разам разьвітаньне і шыбка пабегла ў хату.

(Праняг будзе).

Незалежная беларуская рэспубліка.

Газэта „Виленскій Курьеръ" у № 467 ад 11 лютага 1921 года паведамляе, што Кантрольная Камісія Лігі Народаў рыхтуецца прадставіць Агульнаму Сходу Лігі даклад аб патрэбе расшырэньня плебісцыта таксама і на тую тэрыторыю Беларусі, якая водле рыскага трактата аддадзена Польшчы, пачынаючы з так званай лініі Керзона да бальшавіцкай граніцы, прычым насяленьню будзе зададзена пытаньне — ці яно жадае далучыцца да Польшчы ці хочаць стварыць сваю незалежную Беларускую рэспубліку?

Казармы дзеля плебісцытных войскаў.

Камісія Лігі Народаў рыхтуець у Вільні казармы Шаптыцкага дзеля плебісцытнага чужаземнага войска. (Е. Е.).

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Пятніца, 11 *лютага 1921 г.*

Падарожа Сапегі. Польскі міністр заграмічных спраў вернецца з Парыжа ў Варшаву ў канцы гэтага тыдня. Тады адбудзецца паседжаньне рады міністраў пад старшынствам Начальніка Гаспадарства. На паседжаньні будуць гаварыць аб зробленай ў Парыжы польска-французскай умове.

Лорд Керзон запрасіў міністра Сапегу ў Лёндын на трохдзенную конфэрэнцыю.

Немцы і польска - французская дэклярацыя. Дэклярацыя польскага і французскага ўрадаў моцна адбілася ў Бэрліне. Нямецкія газэты ўважаюць, што дэклярацыя скірована супроць Нямеччыны.

Надзея немцаў на Амэрыку. Нямеччына цяпер вельмі спадзяецца на Амэрыку. На выплату контрыбуцыі перамогшым дзяржавам Антанта прысіляе Нямеччыну пазычыць грошы ў Амэрыкі. Немцы маюць надзею, што Амэрыка зро біць ім пазыку толькі тады, калі яны будуць пазычаць, самахотна а не пад прынукаю.

Конфэрэнцыя у Лендыне і немцы. Нямецкі ўрад паведаміў у ваўторак Францыю і Англію, што ён згаджаецца прыняць вучасьце ў лёндынскай конфэрэнцыі.

Ангельская прэса аб візыце Пілсудзкага у Парыж пішаць у сьцюдзёным тоне, але прызнаець, што польска-францускі хаўрус маець вялікае значаньне, як абарона супроць бальшавікоў і нямецка-савецкага хаўрусу.

Румынія мабілізуецца. Наўпрэкі ўсякім зьняпраўджаньням румынскага ўраду, Румынія паціху мабілізуецца.

Румынія і Савецкая Фэдэрацыя. Чычэрын згодзіўся на прапазыцыю румынскага ўраду распачаць перагаворы і паказаў месца дзеля іх у Рэўлі і старшыней савецкай дэлегацыі—Ліцьвінава.

Забастоука чыгуншчыкау у Польшчы. У зьвязку з частковай забастоўкай ў зялезнадарожных майстэрнях зволькены служачыя, якія не явіліся на работу (Е. Е.).

Субота, 12 *лютага* 1921 *г.*

Ліга Народау вельмі зьдзіўлена, чаму Швэйцарыя адмовілася прапусьціць плебісцытнае войска ў Віленшчыну.

Францыя. У камуністычных цэнтрах шукаюць і трасуць далей.

Савецка-венгерскія перагаворы спыніліся дзеля таго, што Соўнарком затрэбаваў вызваленьня забіўцаў графа Тысы.

Нядзеля, 13 *лютага* 1921 *г.*

Крапоткін памер. Слух аб сьмерці вучонага анархіста, вядомага ўва ўсім сьвеце Крапоткіна, падцьвярджаецца. Пахавалі Крапоткіна ў Маскве.

Перагаворы ў Рызе між палякамі і бальшавікамі, як паведамляецца з Масквы, застыглі на мёртвым пункце. бо Польшча хоча 80 міліёнаў золата, а бальшавікі згаджаюцца даць толькі 30 і то таварамі і ўзваротам страчанага.

Нота Чычэрына лорду Керзону мае ў сабе прапазыцыю распачаць палітычныя перагаворы, бо ў адных гандлёвых перагаворах можна закрануць усіх пытаньрах.

Нямецкія рабочыя зьвярнуліся да рабочых усяго сьвету з просьбаю ўступіцца за Нямеччыну перад Антантай.

Панядзелак, 14 *лютага* 1921 *г.*

Савецкая Федэрацыя быццам-то заявіла, што яна ня хоча толькі, каб ў Віленшчыне былі ў часе плебісцыту ангельскія ці францускія войскі, а супроць іншых яна нічога ня мае.

Расейска-румынскае вайны, як паведамляюць чэскія газэты, ня будзе.

Аўторак, 15 *лютага* 1921 *г.*

Дэмобілізацыя. *Варшава*, 14 лютага (Е. Е.). Кантрольная камісія Лігі Народаў устанавіла, што дэмобілізацыя арміі ген. Жэлігоўскага пачалася.

Пратэст Нямеччыны. Нямецкі ўрад пратэстуе супроць таго, што на граніцах Нямеччыны Польшча сабрала аж 212 тысяч чалавек.

Бельгія мобілізуецца.

Беларускія паны. Польскае міністэрства заграмічных спраў дало сваю згоду на выезд у Рыгу прадстаўніка польскае нацыянальнае рады беларускіх земляў адваката І. Парэмбскага.

Белыя чырванеюць. З Канстантынопаля паведамляюць, што астаткі арміі Врангеля бунтуюцца. Салдаты арганізавалі рэволюцыйныя камітэты.

Серада, 16-*га лютага* 1921 *г.*

Літоуская рэспубліка сьвяткуець трэція угодкі свае незалежнасьці.

Нота Савецкай Расеі Ліцьве.

Народны Камісар заграмічных спраў Чычэрын 1 лютага 1921 году ўручыў прадстаўніку Літоўскай дэмакратычнай рэспублікі ў Расеі п. Балтрушайцісу чародную ноту:

Міласьцівы Гаспадар!

Маю гонар прасіць Вас паведаміць Ваш урад аб ніжэйпісаным:

Расейскі ўрад ня можа глядзець бяз трывогі на непарадкі, якія цягнуцца ў месьце Вільні і яго раёне, перададзеным па дагавору ад 12 ліпня паміж Расеяй і Літвой пад уладу астатняй.

У той мамэнт, калі генерал польскай арміі Жэлігоўскі пры помачы некаторых польскіх войскаў заняў Вільню, і ў гэтае места і яго раён сталі сплывацца афіцэры і салдаты варожных Расейскай рэспубліцы белагвардзейскіх атрадаў, Расейскі ўрад зьвярнуўся з пратэстам з гэтай прычыны да Польскага ўраду, ускладаючы на яго адказнасьць за вынікі дзеяньняў польскага генерала Жэлігоўскага і яго атрадаў.

Расейскі ўрад, аднак, ня можа не зьвярнуць таксама ўвагі Літоўскага ўраду на паміжнародныя абавязкі, якія лажаць на астатнім у ваднесінах да места Вільні і яго раёну. На падставе зробленага паміж Расеяй і Літвой дагавору ад 12 ліпня, Расейскі ўрад мае права дамагацца ад Літоўскага ўраду, каб ён зрабіў усё, што толькі ад яго залежыць, каб спыніць цяперашняе палажэньне справы ў гэтай мясцовасьці, якое пагражаець спакою Савецкіх рэспублік.

Я лічу патрэбным падчыркнуць, што зроблены ў Рызе 12 кастрычніка пралімінарны дагавор паміж Расеяй і Польшчай, аніяк не адмяняець расейска-літоўскага дагавору ад 12 ліпня і ня спыняець яго моцы.

Артыкул 1-шы пралімінарнага дагавору паміж Расеяй і Украінай, з аднаго боку, і Польшчай, з другога боку, пастанаўляець, што пытаньне аб прыналежнасьці да Польшчы або Літвы спрэчных паміж іх тэрыторый належыць разрашэньню выключна паміж Польшчай і Літвой. Гэтая пастанова ёсьць вынікам з факта спыненьня сувэрэнай улады Расейскай Рэспублікі ў адносінах да места Вільні і яго раёну, але яно ніяк не азначаець, што Расейскі ўрад прымушаецца спакойна глядзець на існуючае ў Вільні палажэньне спраў, калі астатняе пагражаець яго небясьпецы.

Да таго часу, пакуль пытаньне аб прыналежнасьці азначаных тэрыторый не разьвяжацца дагаворам паміж Літвой і Польшчай на карысьць астатняй, сувэрэнная ўлада ў месьце Вільні і яго раёне належыць да Літвы, якой яно было перададзена на моцы расейска-літоўскага дагавора. Дзеля гэтага Расейскі ўрад мае права дамагацца ад Літоўскага ўраду, каб ён зрабіў усё магчымае, каб унікнуць ад такого палажэньня спраў у Вільні, пры якім гэтае места служыць для панаваньня і цэнтру вайсковага авантурызму і белагвардзейскіх элемэнтаў, маючых тут спосаб падгатаўляць агрэсыўныя дзеяньні процiў Савецкіх Рэспублік.

Да ведама Расейскага ўраду дайшло, што груп дзяржаў, якая называець сябе „Лігай Нацый", ізноў высоўваець плян адпраўкі ў Вільню паміжнароднага атраду. Расейскі ўрад зварачываець увагу Літоўскага ўраду на тое, што прыбыцьце ў Вільню падобных атрадаў ня можа лічыцца згодным з пастановамі расейска-літоўскага дагавору, пры адсутнасьці абы-якіх дагаворных адносін паміж так званай Лігай Нацый і Расейскай Рэспублікай. У бяручы пад увагу яшчэ ня спыненыя варожыя дзеяньні некаторых уваходзячых у так званую Лігу Нацый дзяржаў у адносінах да Савецкай улады, падобныя атрады павінны разглядацца, як групіроўкі, варожыя ў адносінах да Савецкай Рэспублікі.

Дзеля гэтага мы выказываем цьвёрдую надзею, што Літоўскі урад не дапусьціць паяўленьня ў Вільні падобных атрадаў, прысутнасьць каторых там Расейскі ўрад прымушан разглядаць, як непрыяцельскі ў адносінах да Расеі акт, пагражаючы спакою Савецкіх рэспублік.

Расейскі ўрад пэвен, што Літоўскі ўрад зробіць усё ад яго залежнае, каб спыніць ня згоднае з дагаворамі палажэньне спраў у Вільні і яго раёне і не дапусьціць паяўленьня там вышэй спамянутых паміжнародных атрадаў.

Карыстаюся магчымасьцю, каб прасіць вас, міласьцівы гаспадару, прыняць завярэньне ў глыбокай маёй пашане і ў поўнай маёй адданасьці.

Народны Камісар заграмічных спраў Чычэрын.

Масква, 1 лютага 1921 г.

(Літроста).

Поуны тэкст ноты Літвы Лізе Народау.

ЖЭНЕВА. (Е. Е.). Літоўскі міністр заграмічных спраў Пурыцкіс паслаў 31 студня старшыні Рады Лігі Народаў Лявону Буржуа чародную ноту:

У адказ на ноту Лігі Народаў ад 20 сьнежня 1920 г. маю гонар паведаміць, што Літоўскі урад згаджаецца на поўнае падтрыманьне праэкту справядлівага плебісцыту на тэрыторыях, з-за якіх спрачаюцца Літва з Польшчай. Літоўскі ўрад знаходзіць, што канечныя варункі, на якія павінен абпірацца справядлівы плебісцыт, гэткія:

1) Поўная эвакуацыя польскіх войскаў са спрэчных тэрыторый. Пры невыпаўненьні гэтага варунку насяленьне не магло-б свабодна выказаць сваю волю. Літоўскі ўрад падцьвярджаець з задаваленьнем, што Рада Лігі Народаў споўна разьдзяляець гэткі пагляд.

2) Адміністрацыя плебісцытных тэрыторый павінна знахадзіцца ў руках гаспадарстваў, якія зусім не зацікаўлены ў польска-літоўскім конфлікце і якія прышлюць так сама і войскі для выпаўненьня службы бясьпечнасьці.

3) Бяручы пад увагу тое, што насяленьне баіцца, каб ген. Жэлігоўскі або іншы польскі генерал не заняў ізноў спрэчных тэрыторый па сканчаньні плебісцыту, і дзеля таго што гэтая боязьнь робіць немагчымым свабоднае галасаваньне насяленьня, — канечна патрэбна даць гарантыі, што падобны выпадах не паўторыцца ў будучыне, і прадпрыняць з гэтаю мэтаю энэргічныя крокі. Нямінуема патрэбна таксама абвесьціць самым фармальным парадкам, што польска-літоўская спрэчка будзе аканчальна расуджана плебісцытам.

4) У мэтах правядзеньня справядлівага плебісцыту канечна патрэбна забясьпечыць абедзьвюм старонам поўную роўнасьць. Прынцым роўнасьці парушаецца тым фактам, што спрэчныя тэрыторыі знаходзяцца ў працягу 2-х гадоў пад польскай окупацыяй. Польшча, карыстаючыся гэтым, вядзець энэргічную прапаганду пры помачы ўсіх даступных ёй спасабоў, ліцьвіны ж ня маюць ніякай магчымасьці рабіць уплыў. Каб аднавіць парушаны прынцып роўнасьці, канечна патрэбна ўвясьці на плебісцытных тэрыторыях нейтральную адміністрацыю.

5) Справядлівасьць вымагаець, каб роўнасьць была праведзена таксама і з юрыдычнага боку, г.-ё., каб Літва была прызнана de jure так, як Польшча, і перад плебісцытам, не па сканчаньні яго. Зразумела, што пасьля 7 гадоў вайны і пастаянных трывог, насяленьне горача жадаець устанавіць мір. Аднак, яно баіцца зьвязываць сваю долю і даверыць сваю будучыню няпрызнанаму гаспадарству, тэрыторыя якога можа ў любы мамэнт стаць месцам спрэчак і вайны.

Астаецца яшчэ пытаньне аб збаўленьні ад перашкод, якія йдуць ад Савецкай Расеі. Літоўскі ўрад выпаўніў прапазыцыю Лігі Народаў завязаць перагаворы з савецкім урадам каб дастаць ад яго згоду на прыбыцьце паміжнародных войскаў для абясьпячэньня спакою на спрэчных тэрыторыях, прызнаных за Літвой трактатам 12 ліпня 1920 г.

Ня гледзячы на ўсякае стараньне, якое прадпрыняў у гэтым кірунку літоўскі ўрад, і пасьля пасылкі ў Маскву

спэцыяльнай дэлегацыі,—дасюль не дайшло да згоды ў гэтым пытаньні. Дзеля таго мы спозьніліся даць адказ на ноту Рады Лігі Народаў.

Гэтая акалічнасьць перашкаджаець нам згодзіцца на дапушчэньне паміжнародных войскаў на плебісцытныя тэрыторыі, таму што гэта пагражаець новымі аслажненьнямі і можа выклікаць навет узброены конфлікт заместа жаданнага міру. Савецкая Расея магла-б тады знайсьці прычыну для парушэньня дагавора ад 12 ліпня. Гэта пагражала-бы, ў першы чарод, долі 200 тыс. літоўскіх уцекачоў у Расеі і выклікала-б страту ў Расеі літоўскай маемасьці, якая цэніцца ў некалькі міліярдаў. Літоўскі ўрад яшчэ вядзець перагаворы з саветамі ў гэтым пытаньні. Аднак, ён зварочуецца да Рады Лігі Народаў за помаччу: паказаць польскаму ўраду на патрэбнасьць дабіцца з свайго боку перад савецкім урадам цераз Рыгу згоды на дапушчэньне на плебісцытныя тэрыторыі паміжнароднага вайсковага концінгента.

„Бацька“ і „дэлегацыя“.

Як ведама ўжо з газэт, у Варшаву прыбыла „дэлегацыя“ ад „Ziemi Mińskiej“, якая зрабіла візыты паслом заграгічных дзяржаў, жадаючы недалучэньня Меншчыны да Расеі.

Што гэта за „дэлегацыя“, хто яе выбіраў і дзе, — разумеецца, нікому ня ведама. Скарэй за усе — самі сябе выбралі... Але паслухаем, што далей аб ёй піша „Gazeta Wilenska“ (№ 35):

„Да дэлегацыі зьвярнуўся ген. Балаховіч (г. - ё. самазванны беларускі „бацька“) з запросінамі на конфэрэнцыю. Дэлегаты пастанавілі прыняць запросіны і адправіліся на конфэрэнцыю 8 гэтага лютага. Балаховіч зрабіў дэлегацыі прапазіцыю залажыць у Варшаве сталае прадстаўніцтва Беларускіх земляў, якое санкцыянавала-б яго палітычныя пачынаньні. У размове Балаховіч адзначыў, што ўжо зрабіў 20 міліёнаў доўгу, каторы мае легчы на будучую Беларускую дзяржаву. Конфэрэнцыя не дала ніякіх конкрэтных рэзультатаў. Назаўтрае да дэлегацыі зьвярнуліся некалькі афіцэраў Балаховіча, прапануючы быць асыстэнтамі ў задуманых дэлегацыяй візытах к паслом. Дэлегацыя гэтую прапазіцыю рашуча адкінула“.

Дрэнна прыходзіцца „бацьку“, калі навет падобныя „дэлегацыі“ нічога супольнага з ім мець ня хочуць.

Правінцыяльны аддзел.

Копцявічы, Ашмянскага пав.

Сярод многіх іншых беларускіх вёсак у Віленшчыне трэба абавязкова таксама адзначыць вёску Копцявічы. Вёска гэта з боку беларускасьці адна з лепшых. Тутэйшыя сяляне падтрымліваюць, як могуць, беларускую справу і шчыра жадаюць чуць сваю родную беларускую мову у школе, касьцеле, у валасьці і агулам ува ўсіх публічных установах.

Апрача таго, тутэйшыя земляробы даволі ясна ведаюць, што з зямлёй павінна стацца; для іх ясна, што зямля усякая, як панская так і іншая, павінна адыйсьці да таго, хто яе арэць, барануець, хто яе сваім потам паліваець.

Цяпер у гэтай вёсцы ёсьць школка, у ёй вучыцелем блізкі чалавек Касэвіч. Вучыцель гэты, як мага, стараецца разьвіваць душу беларускіх дзетак. Нядаўна, дзеля яго заходу і клапатаў мясцовая маладзеж адыграла беларускую камэдыю: „Міхалка“. Ігра была, як на вясковыя сілы, дужа добрая. Трэба, каб вучыцель Касэвіч часьцей ставіў такія рэчы і каб вучыў дзетак беларускіх вершаў, расказаў, баяк, гісторыі, помнячы, што ў гэтым праўдзівая карысьць для маладой беларускай душы.

(„Kr.“).

Сьвірская воласьць, Сьвянцянскага павету.

Народ тут у беларускай справе мала сьвядомы, але значны лік ёсьць ужо асьвядомленых людзей. Але нічога дзіўнага, што народ несьвядомы, бо беларускіх газэт можна сказаць ў вочы ня відзіць, а польскіх так сама, апрача работніцкай газэты «Pochodnia», каторую прадаюць у м. Сьвіры, але й тую ня так-то ахвотна раскупліваюць.

— Тут у нас рабілі сьпіскі для выбараў кандыдатаў у сойм. Людзей на сход з усей валасьці ня зьбіралі, як гэта павінна, і людзі аб гэтым нічога ня ведалі, а наказалі для солтысаў і для сваіх прыхільнікаў, каторых і зьявілася чалавек 15—20. Быў нейкі п. Інструктар, але не забыўся „Zarząd gminy“ папрасіць і жандара на гэта сабраньне. Пачалі пісаць кандыдатаў. Хоць на гэтым сабраньні людзі былі з „grona przychylnych“, але паміж імі ці не прабег толькі чорны кот, бо яны пачалі паміж сабой шушукацца (хоць гэта была і забаронена, а на тварах вырысовывалася нейкае нездаваленства. Калі гэтыя „выбаршчыкі“ папыталіся, чаму гэта так зроблена бяз ведама ўсяго народу, то п. войт адказаў, што з гэтага нічога ня выйшла-б, бо людзі увесь дзэнь радзіліся-б і нікога ня выбралі-б. Калі выбаршчыкі папрасілі часу для нарады, то ім пазволілі толькі 5 мінут парадзіцца ў другім пакоі і як тыя увайшлі па 5-ці мінутным перарыве, то п. войт зьвярнуўся с такімі славамі: „Radźcie się nie radźcie, ale musicie wybrać kandydata!.

Адзін чалавек пачаў высказваць свае думкі і цогляды, але яго папрасіў жандар выйсьці за дзьверы, ў праціўным жа выпадку прыгразіў арыштам.

Каго „Zarząd gminy“, хацеў таго і выбралі.

І гэтыя выбары лічуцца свабоднымі выбарамі, дзе чалавек можаць свабодна высказаць свае погляды!

Свабодны.

Школьны аддзел.

Цэнтральная Рада беларускага вучыцельскага хаўруса папоўнена прадстаўнікамі ад валаснога вучыцельскага хаўруса Забрэскае валасьці вучыцялямі М. А. Станкевічам і М. Базеўскім.

Урад беларускага вучыцельскага хаўруса Забрэскае валасьці мае ў сваім складзе М. І. Станкевіча (старшыня), А. Шаўлюка і В. Рэгеля.

З беларускага жыцьця.

«Ксёндз Мацеевіч і беларусы»—пад гэткім назовам зьявіўся ў № 145 «Виленскаго Слова» ад 11 лютага 1921 г. артыкул беларуса маскоўскай культуры Д. Б., у якім аўтор з глыбокім пачуцьцём і багатым веданьнем бароніць свой народ ад нягодных нападак з боку таго панскага ксяндза.

Беларускія студэнты ў Віленскім унівэрсітэце, якіх сёлета ёсьць значна болей, чымся летась, пачалі арганізавацца і шмат ужо зрабілі ў гэтым кірунку.

Беларускую вучыцельку Бердзяеву і яе бацьку выпусьцілі з-пад варты на волю.

Антон Янкоўскі, малады сялянскі хлопец з вёскі Адамчукоў Лаварыскай парафіі, таксама выпушчан на волю пасьля колькі-тыднёвай адседкі ў Лукішскім вастрозе ў Вільні. Выпушчаючы Янкоўскага на волю, ў яго запыталіся, ці будзе ён цяпер пісаць у газэты? Як відаць, заметка, напісаная ў «Нашай Думцы» са слоў Янкоўскага, вельмі не спадабалася пану войту, і ён даў рады, як мог. Але на жаль пана войта знайшлося вышэйшае і разумнейшае начальства...

„Маладое Жыцьцё“. 14 лютага выйшаў першы № журнала „Маладое Жыцьцё“, які выдаецца вучнямі 1-й Віл. Бел. Гімназіі. Цана 20 марак. Прадаецца ў Беларускай Кнігарні на Завальнай 7.

Тэатр для жаўнераў.

(Пісьмо з Лодзі, 8 лютага 1921 г.)

Культурна - Прасьветнай Падкамісіяй Беларускай Вайсковай Камісіі быў арганізованы спэктакль для жаўнераў Беларускага Войска. 6 лютага была пастаўлена „Паўлінка“ Янкі Купалы. Пасьля спэктаклю была дэклямацыя вершаў Мацея Бурачка, Паўловіча, Зязюлі і інш.

Закінутыя на чужыну жаўнеры беларускія вынесьлі вельмі добрае ўражаньне.

Амэрыканская арганізацыя У. М. С. шчыра пайшла насустрэчу нашаму спэктаклю, даўшы сваю салю на гэты вечар.

Ідзе рэпэтыцыя п'есы „Міхалка“ на другі спэктакль.

Свой.

З Літоўскага жыцьця.

Адстаука Вальдэмараса.

Прадстаўнік Літоўскае рэспублікі ў Лізе Народаў прафэсар Вальдэмарас выйшаў ў адстаўку і будзе чытаць лекцыі ў літоўскім унівэрсітэце ў Коўні.

Зьезд літоўскіх коопэратываў склікаецца ў канцы гэтага месяца ў Коўні.

Урачыстая Літоўская вечарына.

16 лютага ў салі Віленсай Літоўскай гімназіі адбылася Літоўская вечарына, з прычыны трэціх угодкаў дзяржаўнай незалежнасьці Літвы.

На вечарыне былі прысутнымі біскуп Віленскай дыэцэзіі Матулевіч-Матуляйціс, японскі і гішпанскі прадстаўнікі Кантрольнай Камісіі Лігі Народаў, прадстаўнікі ад Нацыянальнага Беларускага Камітэту і Жыдоўскай Гміны.

Ад імя Беларус. К-ту выступіў з прывітаючай прамовай кс. А. Станкевіч, які ў гарачых словах выказаў найлепшыя пажаданьні Літоўскаму Народу і яго дзяржаве, закончыўшы сваю прамову словамі: „Няхай жыве Незалежная Літва з сталіцай Вільняй!“

Перапоўненая саля загрымела воплескамі, доўга нескончаўшыміся.

У адказ на беларускае прывітаньне сказаў прамову дырэктар Літоўскай Гімназіі М. Біржышка, закончыўшы яе словамі:

„Няхай жыве незалежная Беларусь!“

Ізноў саля запоўнілася доўгімі воплескамі.

Тутэйшае жцьце

Мітынг „Адраджэньня“.

У нядзелю 13-га лютага ў Вільні адбыўся вельмі клумны мітынг, арганізаваны партыяй польскіх паўпанкаў „Адраджэньне“, на які было запрошана шмат сялян з вёсак.

„Буржуй“.

На „Odrodzenia“ у Ашмянах сяляне сказалі былому дырэктару апрвізацыі Вацлаву Іваноўскаму: „Лепей, пане мініст, солі прывязі, заместа газэтак агітацыйных! На што гэты буржуй прыкідаецца простым!“

(„Паходня“).

Літоўска-польскія перагаворы.

Ад некатарага часу ў газэтах сталі зьяўляцца заметкі аб тым, што у Вільню прыяжджаюць з Коўні прадстаўнікі літоўскіх партыяў для перагавораў з прадстаўнікамі тутэйшых польскіх партыяў аб палітычным палажэньні у нашым краі. Да апошняй пары, аднак, перагаворы гэтыя яшчэ не адбыліся.

Нас вельмі дзівіць у гэтай справе тое, што літоўскія палітычна-грамадзкія дзеячы зьбіраюцца гаварыць з прадстаўнікамі толькі польскіх партыяў, як быццам край наш заселен выключна палякамі. Усім ведама, што мы, беларусы, становім тут вельмі значную масу, з каторай трэба лічыцца. Жывуць у досыць вялізарным ліку у Віленшчыне і Горадзеншчыне і жыды. Яны так сама маюць свой голас. З якой-жа рацыі гаварыць толькі з палякамі?

Тут, мусіць, крыецца непаразуменьне ці простая аплошнасьць з літоўскага боку. Але яе можна і трэба паправіць, бо калі прадстаўнікі польскіх грамадзкіх кругоў думаюць, што Вільня і Віленшчына польскія, і, базіруючыся на гэтым абмылковым сваім праконаньні, не лічацца ні с кім з іншых нацыянальнасьцяў, ігнаруючы іх голас у важных палітычных пытаньнях, то прадстаўнікі літоўскага народу гэтага рабіць не павінны, бо Літва, як такая, ўжо даказала сваю лояльнасьць у адносінах да прызнаньня правоў пражываючых у Ліцьве народаў.

І. М.

Апошняя мінута.

Чацьвер, 17 лютага 1921 г.

Румынія і Польшча. *Парыж*, 16 лютага (F. E.) „Petit Parisien“ паведамляюць, што надняx у Бухарэсьце будзе падпісана ваенная польска-румынская конвенцыя і абаронна-наступаўчы хаўрус.

Атрутнікі. З Варшавы паведамляюць, што злавілі шайку спэкулянтаў, падбаўляўшых у муку шкодныя дзеля здароўя прымешкі, праз што людзі атручаліся.

Ірляндыя. У Дубліне ангельцы заарыштавалі міністра прапаганды ірляндзкага рэвалюцыйнага ўраду Фітугаральда.

Віленская біржа (гэльда).

16 лютага 1921 г.

Царскія 500 р.	2500	мар.
„ 100	475	„
„ дробныя	200—445	„
Думскія 1000 р.	730	„
„ 250	580	„
Кярэнкі	120	„
Доляры	790	„
Фунты	3000	„
Франкі	49	„
Нямецкія маркі	1360	„
Осты	1340	„
Савецкія у буйных купюрах па 5 і 10 тысяч за кожную сотню	4	мар.

Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ

Кооп. Друкарня „ДРУК“, Вострабрамская 5.